***А. А. Будзько***
*Навуковы кіраўнік* — В. М. Шавель,
старшы выкладчык кафедры філалогіі
Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

**ЭМАТЫЎНА АФАРБАВАНЫЯ СКАЗЫ Ў ПАЭМЕ ЯКУБА КОЛАСА «НОВАЯ ЗЯМЛЯ»**

Свае адносіны да апісваемых прадметаў і з'яў пісьменнікі перадаюць не толькі з дапамогай лексічных сродкаў з эмацыянальна-экспрэсіўным адценнем, але і карыстаюцца сінтаксічнымі адзінкамі з эматыўнай афарбоўкай. Яскравым прыкладам таму з'яўляецца паэма Якуба Коласа «Новая зямля».

Эматыўная афарбоўка выказвання ствараецца двума спосабамі: па-першае, толькі інтанацыяй (у мастацкіх творах яна пазначаецца аўтарам); па-другое, выказванне можа быць эматыўна афарбаваным дзякуючы наяўнасці ў ім слова з эматыўным значэннем, пры гэтым інтанацыя «падтрымлівае» семантыку выказвання, створаную лексікай [1, с. 61].

Адным са спосабаў выражэння эмацыянальных ацэнак у паэме Якуба Коласа «Новая зямля» з'яўляюцца клічныя сказы. Дыферэнцыяльнай прыметай такіх сінтаксічных адзінак з'яўляецца клічная інтанацыя — асноўны сродак выражэння эмоцый. Пры дапамозе такой інтанацыі паведамленні, пытанні, пабуджэнні, пажаданні могуць пераўтварацца ў клічныя выказванні, у выніку чаго асноўны змест дапаўняецца эматыўнай афарбоўкай, напрыклад: …А там, за светам, на чужыне/ Ніхто цябе, ой, не прыхіне!/ І як там будзе з той зямлёю?/ *Не хваціш голаю рукою, — / Няпэўна ўсё і невядома,/ Дык больш пільнуйцеся вы дому!* [2, с. 43]; …Ды што паны?! Сам князь Антоні,/ Я памятаю, як сягоння,/ Не раз з Міхалам меў размову./ *І знаў жа службу леснікову!*[2, с. 44] і інш. У прыведзеных прыкладах да паведамлення, пытання дадаюцца эмоцыі, што суправаджаюць лагічны змест выказвання.

Якуб Колас шырока выкарыстоўвае клічныя выказванні, дзе эмацыянальнае адценне надаецца толькі інтанацыяй. Найчасцей яны ўжываюцца ў дыялогах, а словы аўтара падказваюць выбар правільнай інтанацыі, напрыклад: …Бывала, ўлетку, ў час рабочы/ Не раз там чуўся **крык вясёлы**:/ — *Го, тата! дзядзька! выйшлі пчолы!/ На вішні селі каля плоту!* [2, с. 21]; … Ну, а калі дзед падгуляе,/ Тады ён йзноў адменнасць мае,/ Тады ён нават і бушуе/ І трохі сына памуштруе;/ Але пад гэтым бушаваннем/ Хавае **гумар з насміханнем**:/ Больш жарты строіць, чым ваюе./ — *Язэп, ўставай*! — крычыць ён сыну. —/ *Уставай у гэтую ж хвіліну*! [2, с. 109]; …Антось бярэ куродым, сіта, / Глядзіць на гэты рой **сярдзіта**:/ *Вось не было яшчэ бяды!/ Загнаў жа чорт яго туды!* [2, с. 128] і інш.

Эматыўна афарбаваныя клічныя выказванні могуць уключаць слова з эматыўным значэннем. У паэме «Новая зямля» знаходзім прыклады такіх выказванняў, у якіх эматыўнасць не толькі падтрымліваецца інтанацыяй, але і раскрываецца кантэкстам: …— Ану, давай, брат, запрабуем,/ Хоць на цікавасць пакаштуем,/ Які тут сок на новым месце?/ Мо з хлебам можна яго есці?/ — А дзядзечка! мой залаценькі!/ Пастаў нам соку, дарагенькі! [2, с. 73]; … — Ну, а я, тата, ці вялікі? —/ Спытаў Алесь. — Ты? *салапяка!*/ Нос абатры йдзі, *разявака*!/ Ўсё грае носам, бы музыкі/ У гэтай кірпе завяліся. / Вазьмі анучу, абатрыся! [2, с. 39]; … — Ага, ты тут! Ну, *чалавеча*,/ Збірай манаткі і ў Парэчча/ За добры час перабірайся!/ Перад Вялікаднем старайся/ Туды, на месца, перабрацца [2, с. 51] і інш.

Як паказаў аналіз тэксту паэмы, выражэнне эмоцый аўтар неабавязкова афармляе клічнай інтанацыяй. У паэме маюць месца сказы, у канцы якіх стаіць кропка ці пытальнік, але яны выражаюць пэўныя эмацыянальныя адносіны асобы да іншай асобы, прадметаў і з'яў рэчаіснасці, напрыклад:

– спадзяванне, надзея: … *А можа, дасць Бог, ператрэцца.*/ І тут гадок ці два пабудзем», —/ Сабе не верачы і людзям,/ Міхал так думаў, сумняваўся/ І тут астацца спадзяваўся [2, с. 51];

– здзіўленне, абурэнне: … — Ну ж і балота! вось атрута,/ То не работа мне — пакута:/ Ступіў два крокі і спыняйся/ Ды з гэтай пырніцай змагайся./ *І як яны тут, ліха долі,/ З сахой хадзілі ў гэтым полі?/ Як тут расло, на міласць Бога,/ Калі ў зямлю не ўб'еш нарога?* [2, с. 89]. Камунікатыўнай мэтай такіх выказванняў таксама з'яўляецца выражэнне эмоцый.

У некаторых выпадках яно становіцца асноўным у клічных сказах. У гэтым выпадку, як адзначае С. С. Янелюнайтэ, «прызнаецца, што эмацыйнасць выказвання — гэта яго істотная характарыстыка, а не факультатыўная надбудова, эматыўны элемент кадуецца моўцам у выказваннях, г. зн. уваходзіць у камунікатыўную мэтавую устаноўку выказвання» [5, с. 95]. Напрыклад: *…Мой родны кут, як ты мне мілы!../ Забыць цябе не маю сілы*! [2, с. 16]; …Шчупак, брат, ёмкі: на паўпуда, / Але сарваўся. *Ах, паскуда*! / І натаміў як мае быць,/ І пастка ўжо з вады тырчыць,/ Як змей, варочае зянкамі,/ Ну, вось ён, вось! хватай рукамі! [2, с. 29]; … *А як прыгожы пуцявінкі/ Ў шаўках зялёнае травінкі! / Якія мяккія іх рысы / І павароткі іх, абрысы*!/ Ідуць, звіваюцца, лучацца…/ *Эх, слаўна ў лесе, слаўна, братцы*! [2, с. 32] і інш. У дадзеных выказваннях адсутнічае паведамленне, пытанне ці пабуджэнне, бо яны выражаюць тыя ці іншыя эмоцыі моўцы. Выражэнне эмоцыі тут з'яўляецца зместам выказвання.

Улічваючы спецыфіку эмоцый, якія могуць выражаць стан суб'екта ці стаўленне суб'екта да аб'екта, эматыўныя сінтаксічныя адзінкі С. Л. Рубінштэйн падзяляе на дзве групы :

– выказванні, што характарызуюць эмацыйны стан асобы;

– выказванні, што выражаюць эмацыйнае стаўленне чалавека да рэчаіснасці [4, с. 245].

Рэпазіторый БарДУ

Пры семантычнай інтэрпрэтацыі выказванняў першай групы ўказваюцца тры складнікі сітуацыі: суб'ект эмоцыі, сам эмацыйны стан і яго прычына [3, с. 7]. Эматыўныя сінтаксічныя выказванні, што характарызуюць эмацыйны стан асобы, у паэме Якуба Коласа «Новая зямля» складаюць невялікую групу і дапамагаюць аўтару перадаць, напрыклад, адносіны Міхала да пана: … — Ну, пане, будзе цяпер змена,/ І пойдуць новыя парадкі, —/ Міхал выказвае дагадкі./ — А пэўна: будзе талачэча,/ Не без таго ўжо, чалавеча! —/ Ўздыхнуў Ксавэры. — *Шкода пана!*/ Ох, бедны: выбраўся зарана! [2, с. 81] і інш.

Часцей у паэме Якуб Колас выкарыстоўвае эматыўныя выказванні, якія выражаюць эмацыйнае стаўленне чалавека да рэчаіснасці. Пры семантычнай інтэрпрэтацыі такіх выказванняў указваюцца чатыры складнікі сітуацыі: суб'ект эмоцыі, сам эмацыйны стан, яго прычына і аб'ект эмоцыі. У адпаведнасці з гэтым дадзены тып выказвання з'яўляецца накіраванай эмацыйнай рэакцыяй [3, с. 7]. У выказваннях, якія выражаюць стаўленне, адносіны да асобы, эмоцыі спалучаюцца з ацэнкай, напрыклад: … — І дзе ты гэтак налупіўся,/ *Каб ты смалы ўжо напіўся!/ Ото натура!* — жонка лае,/ А ён смяецца, не шманае [2, с. 54] (абурэнне — адмоўная ацэнка); … *Тут так прахладна, так прывольна*!/ А пташкі голасна і здольна/ Смяюцца мілым шчабятаннем/ І поўняць луг сваім спяваннем [2, с. 20] (захапленне — станоўчая ацэнка); … Тут кожна сцежка і дарожка/ Яму даўно-даўно знаёма,/ Міхал у лесе, як бы дома:/ *Дзе ні ступала яго ножка!/ Якіх куточкаў тут не знае*!/ Міхал ідзе, сляды чытае! [2, с. 176] (захапленне — станоўчая ацэнка) і інш.

У паэме «Новая зямля» Якуб Колас выкарыстоўвае сінтаксічныя адзінкі, эматыўная афарбоўка якіх ствараецца дзякуючы інтанацыі, а таксама выказваннямі, у склад якіх уваходзіць слова з эматыўным значэннем. Гэта дало аўтару магчымасць найбольш яскрава і вобразна перадаць не толькі галоўную думку твора, але і выразіць адносіны да апісаных ў паэме герояў і з'яў.

**Спіс крыніц**


1. *Доўгаль, А.* Сродкі выражэння эмоцый у сучаснай беларускай мове / А. Доўгаль. — Мн. : Тэхналогія, 2008. — 176 с.
2. *Колас, Я.* Новая зямля: паэма: для сярэд. і ст. шк. узросту / Я. Колас; прадм. М. Мушынскага. — Мн. : Маст. літ., 2007. — 333 с.
3. *Пиотровская, Л. А.* Эмотивные высказывания в современном русском языке: учеб. пособие / Л. А. Пиотровская. — СПб. : Образование, 1993. — 71 с.
4. *Рубинштейн, С. Л.* Эмоции / С. Л. Рубинштейн // Психология эмоций: учеб. пособие для студентов вузов, обуч. по напр. и спец. психологии / авт.-сост. В. Вилюнас. — СПб., 2004. — С. 244—256.
5. *Янелюнайте, С. С.* Структурно-семантические типы эмотивных высказываний / С. С. Янелюнайте // Сб. науч. тр. МГПИИЯ им. М. Тореза. — М., 1985. — Вып. 249. — С. 93—107.


Материал поступил в редакцию 10.11.2011 г.

**С. А. Буйвіч**
*Навуковы кіраўнік* — Ж. В. Косціна,
магістр педагагічных навук
Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

## ВОБРАЗ ЖАНЧЫНЫ Ў БЕЛАРУСКАМОЎНАЙ ПАЭЗІІ Я. ЧАЧОТА-АСВЕТНІКА

На сучасным этапе развіцця літаратуразнаўчай думкі вывучэнне творчасці пачынальнікаў новай беларускай літаратуры XIX стагоддзя з'яўляецца актуальным, бо яны стаялі ля вытокаў нацыянальнай традыцыі, яе змястоўнай і стылявой асаблівасцей. Значэнне паэзіі Яна Чачота для сучаснай літаратуры цяжка пераацаніць: ён быў сапраўднай пуцяводнай зоркай для многіх пакаленняў беларускіх пісьменнікаў, яркім прыкладам самаадданага служэння свайму народу [8, с. 5].

Паэзія Яна Чачота заснавана на прынцыпах чалавекалюбства і спачування бліжняму. Ён верыў у духоўнае абуджэнне беларускага народа і лічыў, што гэтаму будзе спрыяць пашырэнне асветы на беларускай мове. Пры дапамозе асветы і выхавання паэт імкнуўся паўплываць на маральны стан сялян. Як адзначаюць даследчыкі, «усе беларускамоўныя творы Яна Чачота прасякнутыя асветніцкай ідэалогіяй: у іх дамінуе сентыменталісцкая паэтыка, спалучаная з выразным дыдактызмам» [1, с. 18]. У зборніку «Сялянскіх песенек...», выдадзеным у 1844 годзе, паэт змясціў 19 арыгінальных беларускіх песень, пераклады якіх на польскую мову апублікаваў у сваіх папярэдніх кнігах, і 27 «уласных сялянскіх песенек», напісаных па-беларуску і перакладзеных на польскую мову. На думку У. І. Мархеля, «гэта быў зрух у бок дэмакратычнага чытача, у бок папулярызацыі народнай песні ў арыгінальным гучанні і беларускамоўнай "літаратурнай" песнятворчасці» [3, с. 189]. Паводле польскага даследчыка С. Свіркі, «тэксты маюць найперш дыдактычны характар, у іх асуджаюцца розныя заганы, п'янства вясковага люду. Напісанне вершаў па-беларуску мела мэтай маральнае ўздзеянне на селяніна, бо на польскай мове на вёсцы чытаць не ўмелі» [7, с. 10].

Уся паэтычная творчасць Чачота — гэта глыбока ўсвядомлены патрыятычны подзвіг, які сведчыў аб падыходзе пісьменніка да актуальных праблем беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, аб новай, прагрэсіўнай арыентацыі на шырокія працоўныя масы [4, с. 38].



Репозиторий БарГУ